«У нас ёсць свая краіна. Мы суверэнныя і незалежныя»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт запатрабаваў расказаць пра «ўсе рычагі ўздзеяння» на нядобрасумленных інвестараў. «Я гэтага не баюся. Мы іх павінны паставіць на месца. Так нельга адносіцца да краіны. І папярэдзьце Макея. Я яму даручаў, калі прымаў даверчую грамату чэшскага пасла. Пасол мяне зразумеў. І сказаў, што гэта не варта таго, каб мы сапсавалі адносіны з Чэхіяй», — выказаў думку Аляксандр Лукашэнка.

Акцэнтаваў увагу лідар краіны на тым, што грошы сёння можна рабіць з усяго, асабліва са смецця: ***«У вобласці не павінна быць гэтых смеццевых палігонаў і гор. Гэта ж грошы, велізарныя грошы».***

* * *

Асаблівым пунктам у шматлікіх паездках Аляксандра Лукашэнкі па краіне значацца размовы з жыхарамі рэгіёнаў і працоўнымі калектывамі. Часам яны, як і аб'екты ў маршрутах, з'яўляюцца нечакана (калі Прэзідэнт проста не можа абмінуць людзей, якія стыхійна збіраюцца павітацца з ім), а іншыя разы супрацоўнікі спецыяльна рыхтуюць да сустрэчы свае пытанні. Так было на заводзе газетнай паперы.

Фота БелТА.

НАВОШТА ІМПАРТНАЕ, КАЛІ РОБІМ СВАЁ?

Асноўнымі рынкамі, якія вызначыла для сябе шклоўскае прадпрыемства, з'яўляюцца Расійская Федэрацыя і ўнутраныя патрэбы. Завод дакладна закрые патрэбы краіны ў паперы-аснове. «То-бок 13 тысяч з 30 тысяч (тон. — **«Зв.»**) — гэта імпартазамяшчэнне ў Беларусі. Значыць, мыш не павінна прапаўзці. Усе 13 тысяч ты павінен паставіць любымі шляхамі ў Беларусь. Ніхто не павінен завезці сюды збоку», — даў загад Прэзідэнт.

Пра неабходнасць работы над імпартазамяшчэннем казаў ён і старшыні канцэрна «Беллесапераправа» Юрыю Назараву. ***«Калі ты выробляеш табурэтку, імпартнай табурэткі ў краіне быць не павінна.*** Разумееш? — абурыўся лідар дзяржавы. — Так ва ўсіх краінах. Я ж прыводзіў табе прыклад. Кітай з Амерыкай з гэтай прычыны вайну гандлёвую распачалі».

Прадэманстравалі Аляксандру Лукашэнку альтэрнатыўную прадукцыю завода — папяровую ўпакоўку для разнастайных патрэб. Тут ён нагадаў пра сваё даручэнне пазбаўляцца ад пластыку і даў «зялёнае святло» вытворчасці папяровых пакетаў.

ЖЫЦЬ СА СВАЁЙ ПРАЦЫ

«Наша галоўная сыравіна — гэта мазгі, нашы мазолістыя рукі», — пачаў размову з супрацоўнікамі кіраўнік краіны. Ён нагадаў калектыву, што першапачатковай задачай для маладой незалежнай дзяржавы было — накарміць людзей за кошт развіцця сельскай гаспадаркі. Жывучы ў рэгіёне, багатым на лес, беларусы паралельна ўзяліся за мадэрнізацыю лясной, папяровай прамысловасці.

— Ну вось целяпаемся ўжо дзесяць гадоў. Шмат чаго зрабілі, тэмп добры, але ёсць тры праблемныя прадпрыемствы, па якіх нам неабходна сёння вырашыць праблему. Гэтае (прадпрыемства. — **«Зв.»**) я лічу праблемным — таму і прыехаў, — Добруш, і да розуму трэба давесці Светлагорск. Я там яшчэ пабуду, пагляджу. Мы на праектную магутнасць выходзім. Кажуць людзі, там дрэнна пахне, яшчэ штосьці, — сказаў лідар краіны, заўважыўшы, што гэтага быць не павінна, «але і людзі нашы пераборлівыя вельмі», што ў нейкім сэнсе і нядрэнна.

Прэзідэнт паведаміў, што да канца гэтага года пэўная кампанія створыць і паставіць неабходныя заводу агрэгаты для шматпрофільнай вытворчасці. «І мы ўсё роўна створым патрэбную нам прадукцыю, — запэўніў кіраўнік краіны. — І на знешніх рынках, я ўпэўнены, мы заўсёды будзем мець попыт. Я аб'ехаў увесь свет: ніжэй цэнтру Украіны лясоў няма, а ўсе хочуць нармальную мэблю».

Каб ускочыць у гэты экспартны вагон, неабходна паспяшацца. Прэзідэнт заўважыў, што да шклаўчан асаблівыя патрабаванні: «Вы мае людзі, мы з вамі выраслі на гэтай зямлі. Гэта не галоўная прычына, але мае значэнне, адыгрывае пэўную ролю. Я чамусьці ўпэўнены, што вы тое, што абяцалі, да канца года зробіце. Усё, што неабходна ад дзяржавы, вы атрымаеце, ужо атрымліваеце».

Завод газетнай паперы асвоіў выпуск і пастаўкі драўляных каркасна-шчытавых дамоў тыпу таўнхаус. Іх рэалізацыі перашкаджае старая нарматыўна-прававая база па пажарнай і электрабяспецы. З гэтай праблемай да Прэзідэнта звярнуўся адзін з работнікаў прадпрыемства.

Аляксандр Лукашэнка даручыў у першым квартале вырашыць гэта пытанне. «Я быў у гэтых дамах. Выдатныя. І што за праблемы? Праводка? — здзівіўся ён. — ***Болей бы вы рабілі такіх дамоў і людзі нашы іх будавалі.*** Цэны, як мне кажуць не зусім багатыя людзі, у Шклове нармальныя».

Лідар краіны падзяліўся з землякамі сваім абурэннем: чаму пустуюць участкі, а людзі не хочуць узяць гэтыя кавалкі зямлі? «Чаму не ўзяць? Пабудаваць маленькі домік, хай просценькі цяпер. Але вы зоймеце за сабой паўгектара зямлі. ***Вы забяспечыце жыццё не толькі сваім дзецям, але і ўнукам. Хутка гэтая зямля будзе каштаваць даражэй за золата».***

НАЦІСНУЦЬ НЕ АТРЫМАЕЦЦА

«Нязгода і канфлікт з Расіяй адбыліся з-за таго, што ад нас патрабавалі плаціць за нафту цану кампаніі, большую за сусветную».

Так Прэзідэнт Беларусі абазначыў адну з прычын праблем з краінай-суседкай. Тэма энергарэсурсаў ужо доўгі час гучыць у высокіх кабінетах, загалоўках вядучых медыя, абмяркоўваюць яе ў сем'ях і працоўных калектывах. Таму не дзіўна, што адно з пытанняў да кіраўніка краіны — пра энергетычную бяспеку.

Ён адзначыў, што ў энергетычным сектары работа ідзе вельмі няпроста, таму што эканоміку змяшалі з палітыкай. Ды і, па шчырасці, палітыкі там больш, чым эканомікі. Чаму так?

«Я вам не скажу, хоць заўтра і прэзідэнцкія выбары, што з энергарэсурсамі будзе лягчэй у плане цэнаўтварэння. Лягчэй не будзе. ***Мы ўжо пяць гадоў рушым да сусветнай цаны на нафту, пастаянна, паціху»,*** — растлумачыў Прэзідэнт. Сёння Беларусь мае 18—20 % ад мытнай пошліны, то-бок нафта ў нас крыху таннейшая, чым у свеце.

Расказаў ён і пра падатковы манеўр: «Яны (расійскі бок. — **«Зв.»**) узялі гэту палову, якую мы атрымоўвалі, рэалізуючы нафтапрадукты — свой тавар. Адабраць яе як? Няёмка. І яны здзейснілі манеўр — увялі ў сябе падатак на здабычу карысных выкапняў. І такім чынам паднялі цану на нафту, — растлумачыў Прэзідэнт. — І мы паставілі пытанне: браты дарагія, старэйшы брат, так жа не робяць? Нельга нас за дурняў трымаць». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта зрабілі спецыяльна, каб націснуць на Беларусь.

Каб захаваць узровень па кошце хаця б газу, па словах кіраўніка краіны, ў Беларусі будуць прыняты адпаведныя меры. Ён нагадаў, ***што нам трэба не таннае паліва, а толькі роўныя цэны з расійскімі прадпрыемствамі, і гэта нам калісьці пабяцалі.*** Але памяць у партнёраў, мабыць, дзявочая....

Сусветны кошт за барэль нафты — 62 долары, а расійскія калегі патрабуюць дадатковую прэмію. На тону гэтая сума складзе дзесьці 15—16 долараў. Калі памножыць на 24 мільёны тон (столькі могуць перапрацаваць нашы два заводы — у Мазыры і Наваполацку) — вялікія грошы! «Што датычыцца газу, нас кінулі, не вывелі на роўныя цэны, што датычыцца нафты — плаціце больш, чым яны прадаюць палякам, венграм і немцам», — абурыўся Прэзідэнт.

Расказаў Аляксандр Лукашэнка пра чатыры шляхі «чорнага золата» ў Беларусь і дыверсіфікацыю паставак, пра якую паведамілі на нарадзе ў аўторак. Першыя два, балтыйскія, — праз порт Клайпеды і з Гданьска праз нафтаправод «Дружба», трэці — ад старых сяброў з Венесуэлы. Безумоўна, застанецца доля імпарту і з Расіі.

Прэзідэнт адзначыў, што беларускія прадпрыемствы ўжо не пакутуюць ад закрыцця расійскага харчовага рынку: «Мы гэтым не адказваем, але можам і адказаць». Але навошта?

ВЫБАР ЗА НАРОДАМ

Кіраўнік краіны яшчэ раз запэўніў, што ніколі не пойдзе на аб'яднанне Беларусі і Расіі ў адзіную дзяржаву: «У нас ёсць свая краіна. Мы суверэнныя і незалежныя. ***Мы сваімі мазгамі і рукамі, што змаглі, зарабілі, будуем сваю краіну. І мы не можам быць часткай нейкай краіны.*** Я не магу вам здрадзіць і растварыць Беларусь, хай нават у нашай брацкай Расіі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Нават калі я на гэта пайду, беларусы мяне з'ядуць на працягу аднаго года пасля прыняцця падобнага рашэння. Што датычыцца мяне асабіста — я ўжо напрацаваўся. Мне больш улады ці менш не трэба. У імя таго, каб працягнуць сваё існаванне, атрымаць ключы ад нейкага склада ў Расіі, — для мяне непрымальна. ***Я не хачу быць апошнім Прэзідэнтам Беларусі. Ганарова быць першым, але апошнім быць не хачу».***

«Што датычыцца ўлады, я вам шчыра сказаў: будуць прэзідэнцкія выбары, і вы вырашыце, хто будзе кіраваць краінай. І калі вы мяне не выбераце, я на вас не пакрыўджуся. Гэта будзе ваш выбар. ***Вы павінны вызначыцца — час сур'ёзны, — хто будзе кіраўніком дзяржавы, у якой будуць жыць вашы дзеці»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

ДРУКАВАНАМУ СЛОВУ — БЫЦЬ

Цікавіліся на заводзе, які робіць паперу для айчынных выданняў, і стаўленнем Прэзідэнта да друкаванай прэсы. Кожную раніцу прэс-сакратар рыхтуе яму стос газет ад «СБ—Беларусь сёння» да «Народнай волі» і агляд разнастайных рэсурсаў, што пішуць пра краіну і яе кіраўніка. «Як чалавек старой фармацыі, я не магу адвыкнуць ад друкаванага слова», — падагульніў лідар і дадаў, што не мае нават мабільнага тэлефона.

Інтэрнэт, на яго думку, — вялікая справа, але яшчэ невядома, да чаго ў выніку прывядуць сусветная павуціна і развіццё штучнага інтэлекту.

«Я за тое, каб друкаванае слова было. І я ўпэўнены, што яно нікуды не сыдзе, — сказаў Прэзідэнт. — Так, ёсць нейкі спад, меншы запыт на друкаванае слова, але вы ўбачыце, што яно вернецца і будзе, мабыць, яшчэ вышэй».

* * *

Пасля грунтоўнай размовы Прэзідэнт адправіўся на аб'екты, якія нечакана з'явіліся ў парадку камандзіроўкі. На масларобным заводзе ён наведаў некалькі цэхаў і перайшоў на размешчаную па суседстве прыватную вытворчасць «Данон Шклоў». Аляксандр Лукашэнка даручыў старшыні Магілёўскага аблвыканкама разгледзець магчымасць аб'яднання вытворчых рэсурсаў гэтых двух прадпрыемстваў.

На льнозаводзе Прэзідэнт папрасіў звярнуць увагу на сыравіну: калі прадпрыемства не спраўляецца самастойна з доўгім ільновалакном, ёсць магчымасць аддаць яго іншым вытворцам прадукцыі з «залатога руна».

Размаўляючы з прадстаўнікамі ўлады, Прэзідэнт высветліў, што ехаць на прыватнае дрэваапрацоўчае прадпрыемства не мае сэнсу, бо яно не працуе. Фірма закрэдытаваная і не мае магчымасцяў вырашыць свае праблемы. Аляксандр Лукашэнка даручыў разабрацца з сітуацыяй і далажыць яму.

Такім чынам скончылася чарговая камандзіроўка Прэзідэнта. Магчыма, пасля картэж лідара краіны накіраваўся ў Александрыю, побач з якой б'е Трафімава крыніца, частка яго сямейнай гісторыі — выток калісьці адшукаў і добраўпарадкаваў дзед Прэзідэнта. Аляксандр Рыгоравіч падзяліўся, што ў суботу пад вечар, калі будзе свабадней, збіраецца акунуцца ў гаючую ваду сваёй малой радзімы.

Марыя ДАДАЛКА,
Шклоў.

МЕГАПРАЕКТ БУДУЧЫНІ

Курс — на сонечную энергетыку

Найноўшыя ідэі і іх увасабленне ў тэхніцы і тэхналогіях дазваляюць фарміраваць і суправаджаць буйныя сістэмныя праекты, якія ствараюць базіс для мадэрнізаванай эканомікі. Дзякуючы намаганням навукоўцаў былі створаны эксперыментальныя і доследныя ўзоры электратранспарту і яго кампанентаў. Вядуцца работы па выпуску доследных узораў мадэльнага раду каркасна-панельных легкавых электрамабіляў малога класа з кузавам з кампазітных матэрыялаў, а таксама па стварэнні сямейства камплектных цягавых электрапрывадаў для транспартных і тэхналагічных машын. У бягучым годзе навукоўцы разлічваюць выйсці на доследную вытворчасць пяці новых мадэляў электрамабіляў. Акрамя таго, у найбліжэйшай перспектыве ў кааперацыі з вытворцамі будзе створаны нізкападлогавы электробус з павялічанай дальнасцю прабегу.

Пры навуковым суправаджэнні Акадэміі навук у краіне сфарміравана канкурэнтаздольная біятэхналагічная галіна — агульны аб'ём выпуску прадукцыі па выніках 2019 года склаў амаль 880 млн рублёў. Выпускаюцца лекавыя сродкі «пад ключ»: так, летась было рэалізавана лекавых сродкаў, атрыманых з выкарыстаннем айчынных фармсубстанцый, на суму 5,5 млн рублёў. Ствараюцца новыя высокапрадукцыйныя сістэмы апрацоўкі вялікіх масіваў даных у розных галінах. У ходзе ўкаранення створанай у НАН аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Электронны рэцэпт» летась да яе было падключана амаль 600 устаноў аховы здароўя і 70 аптэчных сетак. Для турыстычнай галіны распрацаваны і ўкаранёны ІТ-аўдыягід, для МНС — макетны ўзор сістэмы аэракасмічнага прагнознага маніторынгу надзвычайных сітуацый і іншае. Нададзены новы імпульс развіццю квантавай інфарматыкі...

У далейшых планах акадэмічных вучоных значыцца стварэнне эксперыментальнай базы для сонечнай энергетыкі, арганізацыя выпуску найноўшых святлотэхнічных вырабаў па тыпе «Разумнае святло», запуск доследнай вытворчасці суперкандэнсатараў. Сістэма аховы здароўя атрымае новыя тэхналогіі, інфармацыйныя сістэмы і лекі на аснове айчынных арыгінальных тэхналогій для развіцця персаніфікаванай медыцыны, прафілактыкі і лячэння шэрагу захворванняў. Будзе весціся распрацоўка ўзораў навучальнай, прамысловай і бытавой рабататэхнікі, арганізавана вытворчае засваенне новых відаў кампазіцыйных матэрыялаў, найноўшых лесахімічных і нафтахімічных прадуктаў.

— Акадэмія навук мае магутны кадравы патэнцыял, але нашым прыярытэтам з'яўляецца праца з моладзю, — падкрэслівае Уладзімір Гусакоў. — Кожны год больш як трыста выпускнікоў ВНУ прыходзяць у акадэмію. Яны адольваюць усе этапы навуковага росту: ад навучання ў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры да прасоўвання па службовай лесвіцы. Мы імкнёмся комплексна вырашаць пытанні самарэалізацыі маладых навукоўцаў, ствараем стымулюючае асяроддзе для іх творчасці, умовы для хуткай публікацыі вынікаў даследаванняў і іх далейшага ўкаранення, даём магчымасць стажыравацца за мяжой. У акадэміі рэалізоўваецца ініцыятыва «Малады навуковец» «пад ключ», дзейнічае разгалінаваная сістэма стымулявання. Вырашаюцца праблемы з жыллём. Новае пачынанне — Рэспубліканскі маладзёжны форум «Беларусь інтэлектуальная», які пройдзе ў красавіку бягучага года. На ім будуць разгледжаны пытанні, звязаныя з пабудовай новай інтэлектуальнай эканомікі, пытанні адукацыі, навуковага і інавацыйнага забеспячэння развіцця высокаінтэлектуальнага грамадства. Важна даведацца, як бачыць гэтыя пытанні моладзь, якія ёсць ідэі...

Попыт на інтэлектуальную ўласнасць

У 2019 годзе доля экспарту навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі ў агульным аб'ёме беларускага экспарту склала больш за 35 % і дасягнула амаль 15 млрд долараў ЗША. Пра гэта прадстаўнікоў СМІ праінфармаваў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Аляксандр ШУМІЛІН.**

Па яго словах, расце попыт на беларускую інтэлектуальную ўласнасць. Так, па выніках года экспарт паслуг у галіне платы за карыстанне аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці перавысіў 100 млн долараў ЗША. «Нашымі распрацоўкамі вельмі актыўна цікавяцца. Замежныя кампаніі гатовыя за іх плаціць», — падкрэсліў старшыня ДКНТ.

Летась было падпісана на 13 % больш дагавораў аб перадачы правоў на аб'екты прамысловай уласнасці, чым у 2018-м.

Таксама ў 2019 годзе забяспечвалася рэалізацыя 112 сумесных міжнародных навукова-тэхнічных праектаў з такімі краінамі, як Карэя, Ізраіль, В'етнам, Куба, Індыя, Пакістан, Польшча, Сербія, Літва, Латвія, Малдова, Украіна, Азербайджан, Арменія, Казахстан, Узбекістан...

Актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы з Кітаем: зацверджана да рэалізацыі 35 беларуска-кітайскіх навукова-тэхнічных праектаў у галіне мікраэлектронікі, аптычных і лазерных тэхналогій, біятэхналогій, новых матэрыялаў.

Кошт выпушчанай прадукцыі і прадастаўленых паслуг у рамках навукова-тэхнічных праграм дасягнуў у 2019 годзе амаль 5 млрд рублёў, — на 2 % вышэй за ўзровень 2018 года (4,8 млрд рублёў).

У рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця ў 2019 годзе рэалізоўвалася 98 інавацыйных праектаў, уведзена ў эксплуатацыю восем новых вытворчасцяў.

«У Беларусі актыўна развіваецца інавацыйная інфраструктура. У цяперашні час функцыянуюць 16 тэхнапаркаў і дзевяць цэнтраў трансферу тэхналогій. Тэхнапаркі створаны ва ўсіх без выключэння абласных цэнтрах нашай краіны, а таксама ў Пінску, Наваполацку, Горках, Ляхавіцкім раёне, — паведаміў Аляксандр Шумілін. — Плануецца іх стварэнне таксама ў Баранавічах, Барысаве, Бабруйску, Оршы і Маладзечне. У студзені 2020 года прынята рашэнне аб прысваенні статусу суб'екта інавацыйнай інфраструктуры ў якасці цэнтра трансферу тэхналогій Баранавіцкаму дзяржаўнаму ўніверсітэту.

У мінулым годзе Мінскі гарадскі тэхнапарк запусціў інжынерную школу рабататэхнікі для школьнікаў. У навукова-тэхналагічным парку БНТУ «Палітэхнік» пры ўдзеле БНТУ і БДУФК быў створаны навукова-адукацыйны кластар «Трансляцыйныя тэхналогіі ў спорце» з мэтай навукова-тэхнічнага і аналітычнага суправаджэння спорту найвышэйшых дасягненняў. За 2019 год у тэхнапарках Беларусі з'явілася больш чым 500 новых працоўных месцаў. Агульная колькасць іх работнікаў перавышае цяпер 2,5 тысячы чалавек.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Супрацоўніцтва

БАЛІВУД І БЕЛАЗ

Менавіта гэтыя кірункі даюць станоўчую дынаміку супрацоўніцтва нашай краіны з далёкай Індыяй, адзначае на прэс-канферэнцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Індыя ў Беларусі Сангіта Бахадур.

Рынак — велізарны

У кастрычніку мінулага года Беларуская калійная кампанія падпісала кантракт з індыйскімі партнёрамі на пастаўку калійных угнаенняў. Згодна з заключаным кантрактам, цана для Індыі склала 280 долараў за тону. Дзеянне дагавора заканчваецца ў канцы сакавіка гэтага года.

Па словах пасла, папярэдні кантракт прадугледжваў цану 290 долараў за тону і дзейнічаў паўгода. Дзеючы кантракт таксама быў заключаны на паўгода. «Я думаю, што будучы кантракт будзе падоўжаны на такіх жа ўмовах, што і раней», — выказала ўпэўненасць Сангіта Бахадур.

Рынак калійных угнаенняў у Індыі з'яўляецца адным з самых прыярытэтных для Беларускай калійнай кампаніі, таму што займае першае месца ў свеце па аб'ёме.

Індыйскі фільм беларускай вытворчасці

Зняты Балівудам у Беларусі кінафільм будзе спрыяць прыцягненню індыйскіх турыстаў. Дыпламат расказала пра паспяховы беларуска-індыйскі праект у галіне кінематаграфіі і адзначыла, што гэта паслужыць пашырэнню цікавасці да Беларусі ў Індыі. «Фільм можа прыцягнуць большую колькасць турыстаў», — падкрэсліла яна, правёўшы паралель з Ісландыяй, у якой пасля знятага там фільма рэзка вырасла колькасць індыйскіх турыстаў. «Фільм дапаможа змясціць вашу краіну на турыстычныя карты для турыстаў Індыі», — упэўненая Сангіта Бахадур.

«Што датычыцца палітычных адносін паміж нашымі дзяржавамі, то яны заўсёды былі цёплыя і сяброўскія», — адзначыла спадарыня Бахадур. Па словах пасла, візітаў і абменаў паміж Беларуссю і Індыяй летась не было, «але мы хочам нагнаць гэта сёлета». Плануюцца візіты на ўзроўні міністраў, запланаваны беларуска-індыйскія кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў.

Закранаючы візавую тэматыку, пасол нагадала, што Індыя ўвяла электронныя візы, кошт якіх складае 20 долараў, прытым што раней ён дасягаў 100 долараў. У цэлым кіраўнік індыйскай дыпламатычнай місіі ўпэўненая, што двухбаковыя турыстычныя кантакты стануць больш актыўныя.

Нашы «цяжкавагавікі» і праграма ІТЕС

Індыйскі дыпламат таксама паведаміла, што яшчэ не падрыхтаваны канчатковыя лічбы па тавараабароце паміж нашымі краінамі за мінулы год. Аднак яна ўпэўненая, што яны значна павялічыліся і перавысілі суму 600 мільёнаў долараў.

Паказчыкі тавараабароту гэтага года будуць павялічаны за кошт новага кантракта БелАЗа на пастаўку буйной тэхнікі, а менавіта: 77 кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю 130 тон і 96 грузападымальнасцю 240 тон і больш. Па словах пасла, кожны самазвал каштуе ад 100 тысяч долараў, таму кантракт, падпісаны ў кастрычніку мінулага года, дазволіць тавараабароту паміж нашымі краінамі значна вырасці.

Больш за 330 беларускіх спецыялістаў з розных сфер прайшлі навучанне ў Індыі па праграме Індыйскага тэхнічнага і эканамічнага супрацоўніцтва МЗС Рэспублікі Індыя (ІТЕС). Па словах пасла, індыйская ўрадавая праграма карыстаецца вялікай папулярнасцю ў беларусаў. Штогод індыйскі бок выдзяляе для Беларусі каля 15 стыпендый.

Сяргей КУРКАЧ.

Без права на забыццё

Міжнародны дзень Халакосту 27 студзеня ва ўсім свеце адзначаюць па-рознаму. У Беларусі сёлета з гэтай нагоды зладзяць канцэрт «Жоўтыя зоркі», сумеснае з Міністэрствам замежных спраў мерапрыемства адбудзецца ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, уручаць грамату «Праведнік свету» нашчадкам аднаго з герояў тых часоў.

Статус «Праведнік свету» даецца людзям розных нацыянальнасцяў, якія, рызыкуючы жыццём, дапамаглі яўрэям. Спецыяльны камітэт правярае іх подзвігі і, калі бачыць падставу, прысуджае пачэснае званне. На жаль, жывых удзельнікаў тых падзей ужо мала, і пачэсныя граматы атрымліваюць іх дзеці і ўнукі. Такі статус прысуджаны 781 беларусу, сваякоў яшчэ чатырох нашых суайчыннікаў шукаюць, подзвіг дзесяці правяраецца, расказаў **Алон ШОГАМ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ізраіля ў Беларусі:**

— Беларусь — адно з тых месцаў, дзе яўрэі і мясцовыя жыхары плячо ў плячо супраціўляліся фашыстам і разам пакутавалі ад іх. Свет не збіраецца забыцца на гэтую з'яву, а рыхтуецца помніць і нагадваць нашчадкам пра тыя цёмныя часы, каб такое не адбылося зноў.

Сведкаў тых падзей усё менш, а памяці пра іх — больш. У нашай краіне тысячы месцаў, дзе пахаваны расстраляныя і закатаваныя яўрэі. Гісторыя Халакосту прайшла доўгі шлях ад маўчання пра яго да нашых часоў, калі мы штодня гаворым пра жахі таго часу і стараемся ўвекавечыць памяць ахвяр.

— З пачатку стварэння яўрэйскай суполкі і фонду «Халакост» людзі ставілі помнікі. Проста ў лесе, полі, месцах, дзе знішчалі яўрэяў, пра што ведалі тутэйшыя. І гэты шлях даў нам неверагодную карту памяці Халакосту на Беларусі, — кажа **Галіна ЛЕВІНА, старшыня Рэспубліканскага фонду «Халакост».**

Цяпер у Беларусі больш за 500 помнікаў ахвярам Халакосту, і іх становіцца ўсё больш. Мяркуецца, што ў сакавіку з'явіцца мабільная праграма для айфонаў на рускай мове, дзе будуць акрэслены ўсе вядомыя памятныя месцы, нават калі гэта проста камень у полі. З часам плануецца перакласці праграму таксама на англійскую і яўрэйскую мовы.

Ірына СІДАРОК.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЮБІЛЕЮ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Рэспубліканскі аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні ўрачыстасцяў у гонар 500-годдзя Жыровіцкага Свята-Успенскага мужчынскага манастыра і 550-годдзя з'яўлення іконы Жыровіцкай Божай Маці правёў учора выязное пасяджэнне ў Жыровіцах. Адміністрацыя Слонімскага раёна і Гродзенскай вобласці, прадстаўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў далі справаздачу аб тым, што ўжо зроблена, а якія справы яшчэ наперадзе, і атрымалі даручэнне трымаць на кантролі працэс падрыхтоўкі да юбілею.

На гэты момант працягваюцца рэстаўрацыя званіцы манастыра і рэканструкцыя брацкага корпуса — аднаго з найстарэйшых будынкаў комплексу, ідзе азеляненне тэрыторыі, таксама ў плане неабходных работ абнаўленне дарог і інжынерных сетак, добраўпарадкаванне сацыяльна значных аб'ектаў у пасёлку Жыровіцы. А пры ўваходзе ў манастыр усталююць роставую скульптуру з бронзы — помнік аднаму з падзвіжнікаў веры архімандрыту Серафіму Жыровіцкаму.

Кіраўнік аргкамітэта віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА падкрэсліў, што добраўпарадкаванне, будаўнічыя, рамонтныя работы і падрыхтоўка аб'ектаў для прыёму і размяшчэння гасцей у пасёлку Жыровіцы і ў Слоніме павінны быць завершаны да пачатку мая. Нагадаем, акрамя галоўных урачыстасцяў у Жыровіцкім Свята-Успенскім манастыры 18—20 мая да юбілею прымеркаваныя прэзентацыя новых турыстычных праектаў, у тым ліку віртуальных, правядзенне навуковых канферэнцый, адкрытага фестывалю «Жыровіцкі фэст», круглых сталоў, тэматычных выставак кніг, ікон і жывапісных палотнаў.

Паводле БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)